# 125 гадоў з дня нараджэння Максіма Багдановіча

9 снежня 2016 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «125 гадоў з дня нараджэння Максіма Багдановіча».
Мастак М.Рыжы. Дызайн А.Мядзведзь.

*Максім Адамавіч Багдановіч (09.12.1891, Мінск – 25.05.1917, Ялта) – класік беларускай літаратуры, паэт, празаік, публіцыст, літаратуразнаўца, перакладчык.*
*Максім Багдановіч быў адным з першых паэтаў, якія ўзбагацілі беларускую літаратуру новымі для яе вершаванымі формамі і тэматычнымі накірункамі, перакладаў на беларускую мову творы класікаў сусветнай літаратуры.*
*На вершы Багдановіча запісваліся музычныя творы, некаторыя з іх сталі народнымі (“Лявоніха”, “Слуцкія паясы” і інш.). Яго творы перакладзены на два дзесятка моў свету.*
*Пра творчасць і жыццё паэта здымаліся фільмы. Яго імем названы вуліцы ў сталіцы і ўсіх абласных гарадах Беларусі, у Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, Ялце і іншых населеных пунктах.*

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».
З больш падрабязнай інфармацыяй можна азнаёміцца на сайце РУП «Белпошта»

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/08-12-2016-1421*